Табліца 1

## Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якая ажыццяўляецца ў вуснай форме

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усвядомленасць вывучанага матэрыялу | Захаванне камунікатыўных якасцей маўлення (лагічнасці, дакладнасці, правільнасці) | Сфарміраванасць універсальных вучэбных дзеянняў |
| 1. | 1 (адзін) | Пазнае (з дапамогай настаўніка) элементы вывучанага матэрыялу (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элементы) | Пры ўзнаўленні элементаў вывучанага матэрыялу дапускае шматлікія парушэнні лагічнасці, дакладнасці маўлення. Дапускае шматлікія арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх | Арыентуецца ў вучэбным дапаможніку з дапамогай настаўніка |
| 2. | 2 (два) | Самастойна пазнае і адрознівае элементы вывучанага матэрыялу (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элементы) | Пры самастойным узнаўленні элементаў вывучанага матэрыялу дапускае шматлікія парушэнні лагічнасці, дакладнасці маўлення. Дапускае шматлікія арфаэпічныя, лексічныя, | Самастойна арыентуецца ў вучэбным дапаможніку |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | граматычныя памылкі, якія выпраўляе пры ўказанні на іх | |
| 3. | 3<br>(тры) | Узнаўляе па памяці<br>(з дапамогай настаўніка і/або не ў поўным аб'еме)<br>элементы вывучанага матэрыялу (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элементы).<br>Прыводзіць прыклады<br>з вучэбнага дапаможніка<br>(з дапамогай настаўніка і/або не ў поўным аб'еме) | Пры ўзнаўленні па памяці элементаў вывучанага матэрыялу дапускае парушэнні лагічнасці, дакладнасці маўлення.<br>Дапускае арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | Разумее сэнс асобных знакава-сімвалічных сродкаў (умоўных абазначэнняў).<br>З дапамогай настаўніка знаходзіць інфармацыю, прад'яўленую ў вучэбным дапаможніку ў яўным выглядзе |
| 4. | 4<br>(чатыры) | Самастойна ўзнаўляе па памяці большую частку вывучанага матэрыялу (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элементы).<br>Самастойна прыводзіць прыклады<br>з вучэбнага дапаможніка | Пры ўзнаўленні па памяці элементаў вывучанага матэрыялу дапускае парушэнні лагічнасці, дакладнасці маўлення.<br>Дапускае арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе самастойна | Разумее сэнс знакава-сімвалічных сродкаў (умоўных абазначэнняў).<br>Самастойна знаходзіць інфармацыю, прад'яўленую ў вучэбным дапаможніку ў яўным выглядзе. Змест адказу адпавядае пастаўленаму пытанню |
| 5. | 5<br>(пяць) | Усвядомлена ўзнаўляе<br>(з дапамогай настаўніка і/або | Пры ўсвядомленым узнаўленні вывучанага | Пры выкананні практыкаванняў выкарыстоўвае<br>з дапамогай настаўніка |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | не ў поўным аб’еме) вывучаны матэрыял (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элемены). З дапамогай настаўніка пацвярджае тэарэтычныя палажэнні ўласнымі прыкладамі | матэрыялу захоўвае лагічнасць выказвання. Дапускае парушэнні дакладнасці маўлення, нешматлікія арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | знакава-сімвалічныя сродкі (умоўныя абазначэнні). З дапамогай настаўніка выконвае аналітыка-сінтэтычныя дзеянні з моўным матэрыялам: аналізуе моўныя адзінкі, адрознівае іх агульныя і адметныя прыметы, групуе моўныя адзінкі па ўказаных прыметах. Устанаўлівае (не ў поўным аб’еме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу. З дапамогай настаўніка знаходзіць інфармацыю, прад’яўленую ў вучэбным дапаможніку ў няяўным выглядзе |
| 6. | 6 (шэсць) | Усвядомлена ўзнаўляе ў поўным аб’еме вывучаны матэрыял (тэрміны, правілы, азначэнні, моўныя адзінкі, іншыя элементы). Самастойна пацвярджае тэарэтычныя палажэнні ўласнымі прыкладамі | Пры самастойным узнаўленні вывучанага матэрыялу захоўвае лагічнасць выказвання. Дапускае парушэнні дакладнасці маўлення, нешматлікія арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе самастойна | Пры выкананні практыкаванняў самастойна выкарыстоўвае знакава-сімвалічныя сродкі (умоўныя абазначэнні). Самастойна выконвае аналітыка-сінтэтычныя дзеянні з моўным матэрыялам: аналізуе моўныя адзінкі, адрознівае іх агульныя і адметныя прыметы, групуе моўныя адзінкі па ўказаных прыметах. Самастойна ўстанаўлівае ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу. Самастойна знаходзіць інфармацыю, прад’яўленую ў вучэбным дапаможніку ў |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | няяўным выглядзе |
| 7. | 7 (сем) | Прымяняе (з дапамогай настаўніка і/або не ў поўным аб'ёме) засвоеныя веды і ўменні пры выкананні заданняў па ўзоры ці вядомым алгарытме | Пры выкананні заданняў па ўзоры ці вядомым алгарытме захоўвае лагічнасць выказвання. Дапускае нешматлікія парушэнні дакладнасці маўлення, адзінкавыя арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | З дапамогай настаўніка параўноўвае і класіфікуе моўныя адзінкі па прапанаваных крытэрыях, устанаўлівае прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці. З дапамогай настаўніка выконвае заданні ў адпаведнасці з прапанаваным алгарытмам дзеянняў. Устанаўлівае (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе выканання вучэбных заданняў. З дапамогай настаўніка ўстанаўлівае сэнсавыя сувязі паміж адзінкамі інфармацыі, прадстаўленай у розных знакавых сістэмах (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме), у розных формах (табліцы, алгарытмы, схемы, іншыя формы) |
| 8. | 8 (восем) | Самастойна прымяняе засвоеныя веды і ўменні пры выкананні заданняў па ўзоры ці вядомым алгарытме | Пры самастойным выкананні заданняў па ўзоры ці вядомым алгарытме захоўвае лагічнасць выказвання. Дапускае нешматлікія парушэнні дакладнасці маўлення, адзінкавыя | Самастойна параўноўвае і класіфікуе моўныя адзінкі па самастойна вызначаных крытэрыях, устанаўлівае прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці. Самастойна выконвае заданні ў адпаведнасці з прапанаваным алгарытмам дзеянняў. Самастойна ўстанаўлівае ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе выканання вучэбных заданняў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | арфаэпічныя, лексічныя, граматычныя памылкі, якія выпраўляе самастойна | Самастойна ўстанаўлівае сэнсавыя сувязі паміж адзінкамі інфармацыі, прадстаўленай у розных знакавых сістэмах (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме), у розных формах (табліцы, алгарытмы, схемы, іншыя формы) |
| 9. | 9 (дзевяць) | Прымяняе (з дапамогай настаўніка і/або не ў поўным аб'ёме) веды і ўменні ў незнаёмай (нестандартнай) сітуацыі, пры выкананні заданняў на трансфармацыю (пераўтварэнне) моўнага матэрыялу | Пры выкананні заданняў па пераўтварэнні моўнага матэрыялу захоўвае лагічнасць, дакладнасць, правільнасць маўлення. Дапускае не больш за 2 арфаэпічныя або граматычныя памылкі, якія выпраўляе самастойна | З дапамогай настаўніка выконвае лагічныя дзеянні з моўным матэрыялам, заданні праблемнага характару на трансфармацыю, інтэрпрэтацыю, інтэграцыю вучэбнага матэрыялу.<br>Устанаўлівае (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе выканання вучэбных заданняў на трансфармацыю (пераўтварэнне) моўнага матэрыялу.<br>З дапамогай настаўніка пераўтварае інфармацыю, прадстаўленую ў розных знакавых сістэмах (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме), у розных формах (табліцы, алгарытмы, схемы, іншыя формы).<br>З дапамогай настаўніка адбірае і выкарыстоўвае інфармацыю з розных крыніц (слоўнікі, даведачная літаратура, інтэрнэт-рэсурсы), абгрунтоўвае |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | і аргументуе свае меркаванні і суджэнні |
| 10. | 10 (дзесяць) | Самастойна прымяняе веды і ўменні ў незнаёмай (нестандартнай) сітуацыі, пры выкананні заданняў на трансфармацыю (пераўтварэнне) моўнага матэрыялу | Пры выкананні заданняў на трансфармацыю (пераўтварэнне) моўнага матэрыялу захоўвае лагічнасць, дакладнасць, правільнасць маўлення | Самастойна выконвае лагічныя дзеянні з моўным матэрыялам, заданні праблемнага характару на трансфармацыю, інтэрпрэтацыю, інтэграцыю вучэбнага матэрыялу. Самастойна ўстанаўлівае ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе выканання вучэбных заданняў на трансфармацыю (пераўтварэнне) моўнага матэрыялу. Самастойна пераўтварае інфармацыю, прадстаўленую ў розных знакавых сістэмах (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме), у розных формах (табліцы, алгарытмы, схемы, іншыя формы). Самастойна адбірае і выкарыстоўвае інфармацыю з розных крыніц (слоўнікі, даведачная літаратура, інтэрнэт-рэсурсы), абгрунтоўвае і аргументуе свае меркаванні і суджэнні |

Заўвагі:

1. Пры кантролі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якая ажыццяўляецца ў вуснай форме, ацэньваецца ўзровень засваення правіл, азначэнняў паняццяў, алгарытму моўных разбораў, а таксама ўменняў, звязаных з аналізам моўных з’яў, пабудовай выказвання на пэўную тэму.

2. Пры вуснай форме кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці ўлічваюцца:

усвядомленасць вывучанага матэрыялу;

захаванне камунікатыўных якасцей маўлення (лагічнасці, дакладнасці, правільнасці);

сфарміраванасць універсальных вучэбных дзеянняў.

маўленчыя памылкі згодна з табліцай 10.

3. У I–II класах ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ажыццяўляецца на змястоўна-ацэначнай аснове з улікам узроўняў вучэбнай дзейнасці без выкарыстання адзнакі (бала) як формы колькаснага выражэння вынікаў ацэначнай дзейнасці.

Табліца 2

Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў пісьмовай форме пры выкананні класных і дамашніх работ

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Колькасць памылак |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | 8 памылак і больш |
| 2. | 2 (два) | 7 памылак |
| 3. | 3 (тры) | 6 памылак |
| 4. | 4 (чатыры) | 5 памылак |
| 5. | 5 (пяць) | 4 памылкі |
| 6. | 6 (шэсць) | 3 памылкі |
| 7. | 7 (сем) | 2 памылкі |
| 8. | 8 (восем) | 1 памылка |
| 9. | 9 (дзевяць) | 1 нягрубая памылка |
| 10. | 10 (дзесяць) | 0 памылак |

Заўвагі:

1. Кантроль і ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці ажыццяўляюцца пры правядзенні пісьмовых работ – навучальных і кантрольных. Пры ацэньванні пісьмовых работ вучняў неабходна ўлічваць памылкі арфаграфічныя (дапушчаныя ў напісанні слоў), пунктуацыйныя (дапушчаныя пры пастаноўцы знакаў прыпынку), граматычныя (дапушчаныя пры ўтварэнні розных часцін мовы, іх форм; пабудове словазлучэнняў і сказаў).

2. Пры праверцы і ацэнцы пісьмовых работ вучняў улічваюцца наступныя віды арфаграфічных памылак: грубыя, нягрубыя, памылкі, якія паўтараюцца, і аднатыпныя.

Грубымі лічацца:

арфаграфічныя памылкі на вывучаныя правілы, прадугледжаныя вучэбнай праграмай: ***атрэзаў*** замест *адрэзаў*; *тра**у**ка* замест *тра**ў**ка*; *збо**жа*** замест *збо**жжа***; *сямя* замест *сям**’**я*; *пашталён* замест *пашталь**ё**н* і іншыя;

пропуск слова з вывучанай арфаграмай.

Кожная памылка ў слоўнікавым слове лічыцца за асобную памылку (*копілюш* замест *капялюш*).

Нягрубымі арфаграфічнымі лічацца наступныя памылкі:

пры пераносе слоў *(пра-ўда, надвор-’е)*, а таксама наўмыснае пазбяганне пераносу слоў;

у напісанні ненаціскных склонавых канчаткаў назоўнікаў, прыметнікаў, ненаціскных асабовых канчаткаў дзеясловаў (у IV класе). У II і III класах памылкі на пералічаныя правілы выпраўляюцца, але не ўлічваюцца;

графічныя памылкі і апіскі (замена адной літары другой – *с**п**уп* замест *с**л**уп*; перастаноўка літар – ***шс**ытак* замест ***сш**ытак*; паўтор адной і той жа літары ў слове – *м**аа**лы замест м**а**лы*; паўтор аднаго і таго ж склада ў слове – *прыго**го**жы* замест *прыгожы*; пропуск літары ў слове – *рабта* замест *раб**о**та*);

адлюстраванне на пісьме замест літар *е, ё, ю, я, і* іх гукавога значэння (***йа**блык* замест ***я**блык*);

пропуск слова без вывучанай арфаграмы.

Памылкамі, якія паўтараюцца, лічацца памылкі ў адным і тым жа слове ці формах аднаго і таго ж слова (*бероза, берозы, берозай* замест *бяроза, бярозы, бярозай*). Незалежна ад іх колькасці, яны лічацца за адну памылку.

Памылкі, якія паўтараюцца (грубыя, нягрубыя), выпраўляюцца настаўнікам у кожным слове з дапушчанай памылкай.

Памылкі на адно вывучанае правіла, дапушчаныя ў розных словах (аднатыпныя памылкі), лічацца ў кожным слове асобнай памылкай (*рыпка, каска, лышка* замест *рыбка, казка, лыжка* – правапіс парных па звонкасці/глухасці зычных у сярэдзіне слова).

Напісанні, што з’яўляюцца пад уплывам графікі рускай мовы *(і – и)*, выпраўляюцца, але за памылку не лічацца.

3. У пісьмовых работах вучнямі могуць быць дапушчаны грубыя і нягрубыя пунктуацыйныя памылкі.

Грубыя пунктуацыйныя памылкі:

пропуск знака прыпынку ў канцы сказа;

пропуск коскі паміж аднароднымі членамі сказа.

Нягрубыя пунктуацыйныя памылкі:

адсутнасць чырвонага радка;

пастаноўка кропкі ў загалоўку тэксту.

Дзве нягрубыя пунктуацыйныя памылкі прыраўноўваюцца да адной грубай.

4. Граматычнымі памылкамі лічацца:

парушэнне сінтаксічных норм спалучальнасці слоў (*хварэць грыпам* замест *хварэць на грып*);

няправільнае ўтварэнне і ўжыванне склонавых форм іменных часцін мовы, асабовых форм дзеясловаў (*у кніге* замест *у кнізе*; *бярэць* замест *бярэ*);

памылкі ў словаўтварэнні (куст ружы *змерзнуў* замест *змерз*);

парушэнне меж сказа *(У двары дзеці гулялі ў снежкі. І каталіся на санках)*.

Граматычныя памылкі лічацца нягрубымі.

5. Пры ацэньванні навучальных класных і дамашніх работ, якія праводзяцца ў пісьмовай форме, у колькасны паказчык памылак уключаюцца сумарна ўсе арфаграфічныя, пунктуацыйныя, граматычныя і іншыя памылкі.

У навучальных работах два выпраўленні на месцы грубых памылак лічацца за адну нягрубую памылку.

У выпадку, калі вучань спісаў практыкаванне, але не прыступіў да выканання задання (заданняў), аб'ём выкананай работы складае 50 %, што адпавядае 4 дапушчаным памылкам.

Табліца 3

Нормы ацэнкі дыктанта

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Колькасць памылак |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Больш, чым на 2 балы |
| 2. | 2 (два) | 0/9*,1/8, 1/9, 2/7, 2/8, 3/6, 3/7, 4/5, 4/6, 5/4, 5/5, 6/3, 6/4, 7/2, 8/1, 8/2, 9/0, 9/1, 10/0 |
| 3. | 3 (тры) | 0/7, 0/8, 1/6, 1/7, 2/5, 2/6, 3/4, 3/5, 4/3, 4/4, 5/2, 5/3, 6/0, 6/1, 6/2, 7/0, 7/1, 8/0 |
| 4. | 4 (чатыры) | 0/6, 1/5, 2/4, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 |
| 5. | 5 (пяць) | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 |

| | | |
|---|---|---|
| 6. | 6 (шэсць) | 0/4, 1/3, 2/2, 3/0, 3/1 |
| 7. | 7 (сем) | 0/3, 1/2, 2/0, 2/1 |
| 8. | 8 (восем) | 0/2, 1/0, 0/1, 1/1 ці 2 нягрубыя памылкі |
| 9. | 9 (дзевяць) | 1 нягрубая памылка |
| 10. | 10 (дзесяць) | 0/0 памылак |

*У лічніку – колькасць арфаграфічных памылак, у назоўніку – пунктуацыйных.

Табліца 4

## Шкала, якая вызначае максімальную колькасць балаў за выкананне дадатковых заданняў да дыктанта

| № п/п | Нумар задання | Узровень задання | Максімальная колькасць балаў за выкананне задання |
|---|---|---|---|
| 1. | 1 | заданне другога ўзроўню | 5 |
| 2. | 2 | заданне трэцяга ўзроўню | 10 |
| 3. | 3 | заданне чацвёртага ўзроўню | 15 |
| | | | Сумарны максімальны бал за выкананне ўсіх заданняў – 30 |

Табліца 5

## Нормы ацэнкі слоўнікавага дыктанта

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Колькасць памылак |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | 7 памылак і больш |
| 2. | 2 (два) | 6 памылак |
| 3. | 3 (тры) | 5 памылак |
| 4. | 4 (чатыры) | 4 памылкі |
| 5. | 5 (пяць) | 3 памылкі |
| 6. | 6 (шэсць) | 2 памылкі |
| 7. | 7 (сем) | 1 памылка |
| 8. | 8 (восем) | 1 выпраўленне на месцы грубай памылкі ці |

| | | |
|---|---|---|
| | | 2 выпраўленні на месцы нягрубай памылкі |
| 9. | 9 (дзевяць) | 0 памылак, 1 выпраўленне на месцы нягрубай памылкі |
| 10. | 10 (дзесяць) | 0 памылак, без выпраўленняў |

Табліца 6

## Нормы ацэнкі пісьменнасці пры выкананні кантрольнай работы

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Аб'ём выкананых заданняў і сумарная колькасць памылак (арфаграфічных, пунктуацыйных, граматычных) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Выкананы ўсе заданні і дапушчана: | Выкананы 4 заданні і дапушчана: | Выкананы 3 заданні і дапушчана: | Выкананы 2 заданні і дапушчана: | Выканана 1 заданне і дапушчана: |
| 1. | 1 (адзін) | 8 памылак і больш | 7 памылак і больш | 6 памылак і больш | 5 памылак і больш | 4 памылкі і больш |
| 2. | 2 (два) | 7 памылак | 6 памылак | 4-5 памылак | 3-4 памылкі | 2-3 памылкі |
| 3. | 3 (тры) | 6 памылак | 5 памылак | 3 памылкі | 2 памылкі | 1 памылка |
| 4. | 4 (чатыры) | 5 памылак | 4 памылкі | 2 памылкі | 1 памылка | 1 нягрубая памылка |
| 5. | 5 (пяць) | 4 памылкі | 3 памылкі | 1 памылка | 1 нягрубая памылка | 0 памылак |
| 6. | 6 (шэсць) | 3 памылкі | 2 памылкі | 1 нягрубая памылка | 0 памылак | – |
| 7. | 7 (сем) | 2 памылкі | 1 памылка | 0 памылак | – | – |
| 8. | 8 (восем) | 1 памылка | 1 нягрубая памылка | – | – | – |
| 9. | 9 (дзевяць) | 1 нягрубая памылка | 0 памылак | – | – | – |
| 10. | 10 (дзесяць) | 0 памылак | – | – | – | – |

Табліца 7

## Шкала, якая вызначае максімальную колькасць балаў за выкананне заданняў тэставай кантрольнай работы

| № п/п | Нумар задання | Максімальная колькасць балаў за выкананне задання |
|---|---|---|
| 1. | 1 | 2 |
| 2. | 2 | 4 |
| 3. | 3 | 6 |
| 4. | 4 | 8 |

| | | |
|---|---|---|
| 5. | 5 | 10 |
| | | Сумарны максімальны бал за выкананне ўсіх заданняў – 30 |

Табліца 8

Шкала, якая вызначае максімальную колькасць балаў за выкананне заданняў камбінаванай кантрольнай работы

| № п/п | Нумар задання | Узровень задання | Максімальная колькасць балаў за выкананне задання |
|---|---|---|---|
| 1. | 1 | заданне трэцяга ўзроўню | 4 |
| 2. | 2 | заданне трэцяга ўзроўню | 4 |
| 3. | 3 | заданне трэцяга ўзроўню | 4 |
| 4. | 4 | заданне чацвёртага ўзроўню | 8 |
| 5. | 5 | заданне пятага ўзроўню | 10 |
| | | | Сумарны максімальны бал за выкананне ўсіх заданняў – 30 |

Табліца 9

Шкала пераводу сумарнай колькасці балаў, атрыманых вучнем за выкананне дадатковых заданняў да дыктанта, заданняў тэставай кантрольнай работы, заданняў камбінаванай кантрольнай работы, у адзнаку ў балах па дзесяцібальнай шкале

| № п/п | Колькасць балаў, атрыманых вучнем | Адзнака у балах па дзесяцібальнай шкале |
|---|---|---|
| 1. | 1 | 1 (адзін) |
| 2. | 2 | 2 (два) |
| 3. | 3–5 | 3 (тры) |
| 4. | 6–8 | 4 (чатыры) |
| 5. | 9–11 | 5 (пяць) |

| | | |
|---|---|---|
| 6. | 12–16 | 6<br>(шэсць) |
| 7. | 17–21 | 7<br>(сем) |
| 8. | 22–25 | 8<br>(восем) |
| 9. | 26–28 | 9<br>(дзевяць) |
| 10. | 29–30 | 10<br>(дзесяць) |

Заўвагі:

1. Тэматычны кантроль ажыццяўляецца пры правядзенні кантрольных і тэматычных самастойных работ (спісванне ў I і II класах, дыктант, дыктант з дадатковым заданнем, слоўнікавы дыктант, тэставая работа, камбінаваная работа). Колькасць і віды тэматычных самастойных работ не рэгламентаваны.

2. У кантрольных і тэматычных самастойных работах два выпраўленні на месцы грубых памылак лічацца за адну грубую памылку. Пры вызначэнні адзнакі ў балах няцотная колькасць нягрубых памылак акругляецца на карысць вучня.

Калі ў рабоце вучань дапускае выпраўленні не на месцы вывучаных арфаграм, то пры наяўнасці:

1-2 такіх выпраўленняў адзнака не зніжаецца;

3-5 выпраўленняў – адзнака зніжаецца на 1 бал;

больш за 5 выпраўленняў – на 2 балы.

Дадзеныя патрабаванні распаўсюджваюцца на ўсе віды пісьмовых работ, за выключэннем слоўнікавага дыктанта, які праводзіцца з мэтай праверкі засваення правапісу слоў з неправяраемымі арфаграмамі.

3. Дыктант з дадатковым заданнем складаецца з дыктанта і трох дадатковых заданняў, якія адпавядаюць другому, трэцяму і чацвёртаму ўзроўням вучэбнай дзейнасці. У якасці дадатковых выкарыстоўваюцца фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, лексічныя і іншыя заданні.

Усе арфаграфічныя, пунктуацыйныя і граматычныя памылкі, дапушчаныя пры выкананні дадатковых заданняў, уносяцца ў агульную колькасць памылак за дыктант і ўлічваюцца пры выстаўленні адзнакі за дыктант.

4. Дадатковае заданне да дыктанта ацэньваецца з выкарыстаннем шкал згодна з табліцамі 4 і 9.

5. Праверка і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па вывучанай тэме (тэмах) можа ажыццяўляцца пры выкананні вучнямі кантрольнай тэставай работы або камбінаванай кантрольнай работы. На выкананне кожнай з гэтых кантрольных работ можа адводзіцца 20–25 мінут урока.

У тэставай і камбінаванай кантрольных работах выкарыстоўваюцца заданні закрытага і адкрытага тыпаў: з выбарам адказу, з кароткім і свабодным адказамі, заданні на ўстанаўленне адпаведнасці, вызначэнне паслядоўнасці дзеянняў, іншыя заданні.

6. Па выніках кантрольнай работы выстаўляюцца дзве адзнакі: у лічніку – адзнака за правільнасць выканання заданняў, у назоўніку – за пісьменнасць (арфаграфічнае, пунктуацыйнае, граматычнае афармленне).

Пры вывядзенні бала за пісьменнасць улічваецца колькасць выкананых заданняў і сумарная колькасць дапушчаных памылак (арфаграфічных, пунктуацыйных, граматычных). Адзнака за пісьменнасць выстаўляецца з ужываннем норм ацэнкі пісьменнасці пры выкананні кантрольнай работы згодна з табліцай 6.

7. Тэставая кантрольная работа выяўляе пааперацыйны склад дзеянняў вучня па вывучанай тэме (тэмах) і ўключае пяць заданняў, якія адпавядаюць пяці ўзроўням вучэбнай дзейнасці.

Выкананне заданняў тэставай кантрольной работы ацэньваецца з выкарыстаннем шкал згодна з табліцамі 7 і 9.

8. Камбінаваная работа змяшчае пяць заданняў, якія адпавядаюць трэцяму, чацвёртаму і пятаму ўзроўням вучэбнай дзейнасці. Камбінаваная работа ацэньваецца з выкарыстаннем шкал згодна з табліцай 9 і табліцай 5.

Выкананне заданняў камбінаванай кантрольной работы ацэньваецца з выкарыстаннем шкал згодна з табліцамі 8 і 9.

9. У дачыненні да табліц 4, 7, 8: калі заданне адпаведнага ўзроўню вучэбнай дзейнасці вучняў выканана часткова, то доля правільна выкананага задання вылічваецца ў адносінах да максімальнага бала гэтага задання. Усе балы сумуюцца. У выпадку атрымання няцэлага ліку праводзіцца яго акругленне да. цэлага ліку па правілах матэматычнага акруглення.

Табліца 10

Нормы ацэнкі пераказу і сачынення

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяці-бальнай шкале | Змест | Памылкі | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Зместавыя і маўленчыя | Арфаграфічныя (разам з граматычнымі) і пунктуацыйныя |
| 1. | 1 (адзін) | Тэкст не завершаны. Тэма і асноўная думка не раскрыты | Памылак больш, чым на 2 балы | Памылак больш, чым на 2 балы |
| 2. | 2 (два) | Тэкст завершаны, але тэма і асноўная думка не раскрыты | 3/3**, 3/4, 3/5 | 8/0***, 8/1, 7/2, 7/3, 6/4, 5/5, 4/6, 3/7 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3. | 3 (тры) | Тэма раскрыта часткова, асноўная думка не раскрыта | 3/0, 3/1, 3/2 | 7/0, 7/1, 6/2, 6/3, 5/4, 4/5, 3/6, 2/7 |
| 4. | 4 (чатыры) | Тэма і асноўная думка раскрыты часткова | 2/3, 2/4, 2/5 | 6/0, 6/1, 5/2, 5/3, 4/4, 3/5, 2/6 |
| 5. | 5 (пяць) | Тэма і асноўная думка ў цэлым раскрыты | 2/0, 2/1, 2/2 | 5/0, 5/1, 4/2, 4/3, 3/4, 2/5, 1/6 |
| 6. | 6 (шэсць) | Тэма і асноўная думка ў цэлым раскрыты | 1/2, 1/3, 1/4 | 4/0, 4/1, 3/2, 3/3, 2/4, 1/5, 0/6 |
| 7. | 7 (сем) | Тэма і асноўная думка раскрыты | 0/4, 1/0, 1/1<br>0/5**** | 3/0, 3/1, 2/2, 2/3, 0/5, 1/4 |
| 8. | 8 (восем) | Тэма і асноўная думка раскрыты поўнасцю | 0/3<br>0/4**** | 2/0, 2/1, 1/2, 1/3, 0/4 |
| 9. | 9 (дзевяць) | Тэма і асноўная думка раскрыты поўнасцю | 0/1, 0/2<br>0/3**** | 1/0, 1/1, 0/1, 0/2, 0/3 |
| 10. | 10 (дзесяць) | Тэма і асноўная думка раскрыты поўнасцю | 0/0<br>0/1****<br>0/2**** | 0/0, 1 нягрубая |

**У лічніку – колькасць зместавых памылак, у назоўніку – колькасць маўленчых памылак.

***У лічніку – колькасць арфаграфічных памылак (разам з граматычнымі), у назоўніку – пунктуацыйных.

****Для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.

Заўвагі:

1. Для ацэнкі камунікатыўна-маўленчых уменняў і навыкаў вучняў праводзяцца творчыя работы – пераказы і сачыненні, якія носяць навучальны характар. Іх ацэньванне праводзіцца з улікам двух параметраў:

змест;

пісьменнасць.

2. Змест пераказу і сачынення ацэньваецца з улікам наступных крытэрыяў:

адпаведнасць тэме і асноўнай думцы;

паўната раскрыцця тэмы;

лагічнасць і паслядоўнасць выкладу фактычнага матэрыялу;

наяўнасць ці адсутнасць маўленчых памылак.

Зместавымі (тэкставымі) памылкамі лічацца:

неадпаведнасць зместу тэксту абазначанай у загалоўку тэме;

нераскрыццё асноўнай думкі;

парушэнне лагічнасці, паслядоўнасці развіцця думкі ў тэксце.

3. Маўленчыя памылкі – гэта памылкі, звязаныя з парушэннем патрабаванняў камунікатыўных якасцей маўлення (дакладнасці, чысціні, багацця, дарэчнасці).

Маўленчымі памылкамі лічацца:

неабгрунтаваны паўтор аднаго і таго ж слова (*Кацяня* сядзела на дрэве. *Кацяня* жаласна мяўкала. *Кацяня* не магло злезці з дрэва);

неабгрунтаванае ўжыванне побач аднакаранёвых слоў (*У лесе ляснік* знайшоў рэдкую кветку);

ужыванне слова ў неўласцівым значэнні (*паважны* чалавек замест *паважаны* чалавек);

ужыванне дыялектных і прастамоўных слоў (*транвай* замест *трамвай*; *лабалаторыя* замест *лабараторыя*).

Кожная маўленчая памылка лічыцца за палову памылкі. Пры вывядзенні бала няцотная колькасць маўленчых памылак акругляецца на карысць вучня.

4. Пісьменнасць ацэньваецца з улікам наяўнасці або адсутнасці арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак.

5. Колькасць зместавых і маўленчых памылак улічваецца сумарна пры выстаўленні адзнакі за змест пераказу або сачынення.

6. Пры выстаўленні адзнакі за пісьменнасць у колькасны паказчык арфаграфічных памылак уключаюцца і граматычныя памылкі.

13. Кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце **«Літаратурнае чытанне»** ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах. Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па гэтым вучэбным прадмеце, якія вызначаны ў **дадатку 3** да Правіл правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11.07.2022 № 184, з улікам заўваг да іх, якія вызначаны дадзенымі Метадычнымі ўказаннямі.

Табліца 1

Нормы ацэнкі навыку чытання ўслых і вуснага адказу па змесце прачытанага твора

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі | |
|---|---|---|---|
| | | Навык чытання | Чытацкія ўменні |
| 1. | 1 (адзін) | Манатоннае* складовае чытанне ў празмерна запаволеным тэмпе. Дапускае 9 і больш | Пазнаванне з дапамогай настаўніка асобных элементаў праграмнага вучэбнага матэрыялу (назвы прачытанага твора, яго аўтара; |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | тэхнічных** і/або арфаэпічных памылак, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх | дзеючых асоб, падзей, эпізодаў або карцін прыроды, апісаных у творы; жанру прачытанага твора; элементаў кнігі), кніг пэўнага аўтара або на дадзеную тэму.<br>Маўленне непаслядоўнае, невыразнае са шматлікімі маўленчымі і граматычнымі памылкамі |
| 2. | 2<br>(два) | Манатоннае складовае чытанне ў празмерна запаволеным тэмпе. Дапускае 9 і больш тэхнічных і/або арфаэпічных памылак, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | Самастойнае пазнаванне і адрозненне элементаў праграмнага вучэбнага матэрыялу (назвы прачытанага твора, яго аўтара; дзеючых асоб, падзей, эпізодаў або карцін прыроды, апісаных у творы; жанру прачытанага твора; элементаў кнігі), кніг пэўнага аўтара або на дадзеную тэму.<br>Маўленне непаслядоўнае, невыразнае са шматлікімі маўленчымі і граматычнымі памылкамі |
| 3. | 3<br>(тры) | Манатоннае чытанне з элементамі складовага чытання ў запаволеным тэмпе, празмернае расцягванне асобных слоў і складоў. Дапускае 7-8 тэхнічных і/або арфаэпічных памылак, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх | Узнаўленне па памяці (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) праграмнага вучэбнага матэрыялу (назвы і аўтара прачытанага твора, яго жанру; дзеючых асоб, падзей, эпізодаў або карцін прыроды, апісаных у творы; назваў элементаў кнігі).<br>Выкананне з дапамогай настаўніка па ўзоры дзеянняў, звязаных з арыенціроўкай па тэксце.<br>Знаходжанне і выбар (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) інфармацыі, прад'яўленай у прачытаным творы ў яўным выглядзе: устанаўленне прамой сувязі (па ключавых словах).<br>Маўленне не заўсёды паслядоўнае, малавыразнае, утрымлівае шмат маўленчых і граматычных памылак |
| 4. | 4<br>(чатыры) | Манатоннае чытанне з элементамі складовага чытання ў запаволеным тэмпе, празмернае | Самастойнае ўзнаўленне па памяці праграмнага вучэбнага матэрыялу (назвы і аўтара прачытанага твора, яго жанру; дзеючых асоб, падзей, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | расцягванне асобных слоў і складоў. Дапускае 7-8 тэхнічных і/або арфаэпічных памылак, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | эпізодаў або карцін прыроды, апісаных у творы; назваў элементаў кнігі).<br>Самастойнае выкананне па ўзоры дзеянняў, звязаных з арыенціроўкай па тэксце.<br>Самастойнае знаходжанне і выбар інфармацыі, прад'яўленай у прачытаным творы ў яўным выглядзе: устанаўленне прамой (па ключавых словах) і ўскоснай (сінанімічнай) сувязі.<br>Маўленне не заўсёды паслядоўнае, малавыразнае, утрымлівае шмат маўленчых і граматычных памылак |
| 5. | 5<br>(пяць) | Чытанне цэлымі словамі ў запаволеным тэмпе, складовае чытанне цяжкіх слоў (незразумелых па сэнсе і складаных па структуры). Дапускае 5-6 тэхнічных і/або арфаэпічных памылак. Інтанацыйныя недакладнасці; памылкі ў пастаноўцы лагічных націскаў*** | Узнаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) на ўзроўні разумення праграмнага вучэбнага матэрыялу з указаннем агульных і адметных істотных прымет твораў розных жанраў і тэматыкі; знаходжанне ў тэксце мастацка-выразных сродкаў; прагназаванне зместу твора па ілюстрацыях і загалоўку; вызначэнне тэмы і галоўнай думкі твора, суаднясенне загалоўка твора з яго тэмай і галоўнай думкай; устанаўленне і тлумачэнне прычынна-выніковых сувязей паміж падзеямі.<br>Параўнанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) мастацкіх твораў розных жанраў; герояў, падзей, паэтычных карцін прыроды (аднаго або некалькіх твораў) па дадзеных прыметах.<br>Выкананне з дапамогай настаўніка дзеянняў, звязаных з арыенціроўкай па тэксце, па прапанаваным алгарытме.<br>Устанаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе аналізу мастацкага твора.<br>Знаходжанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | інфармацыі, прад'яўленай у прачытаным творы ў няяўным выглядзе (падтэкст; скрытыя дапушчэнні або сцвярджэнні; выбар дадатковай інфармацыі з ілюстрацыі да тэксту або іншай крыніцы).<br>Маўленне пераважна паслядоўнае, звязнае, выразнае з асобнымі маўленчымі і граматычнымі памылкамі |
| 6. | 6<br>(шэсць) | Чытанне цэлымі словамі ў запаволеным тэмпе, складовае чытанне цяжкіх слоў (незразумелых па сэнсе і складаных па структуры). Дапускае 3-4 тэхнічныя і/або арфаэпічныя памылкі. Інтанацыйныя недакладнасці; памылкі ў пастаноўцы лагічных націскаў | Самастойнае ўзнаўленне на ўзроўні разумення праграмнага вучэбнага матэрыялу з указаннем агульных і адметных істотных прымет твораў розных жанраў, відаў і тэматыкі; знаходжанне ў тэксце мастацка-выразных сродкаў мовы; прагназаванне зместу твора па ілюстрацыях і загалоўку; вызначэнне тэмы і галоўнай думкі твора, суаднясенне загалоўка твора з яго тэмай і галоўнай думкай; устанаўленне і тлумачэнне прычынна-выніковых сувязей паміж падзеямі.<br>Самастойнае параўнанне мастацкіх твораў розных жанраў; герояў, падзей, паэтычных карцін прыроды (аднаго або некалькіх твораў) па дадзеных прыметах.<br>Самастойнае выкананне дзеянняў, звязаных з арыенціроўкай па тэксце, па прапанаваным алгарытме.<br>Самастойнае ўстанаўленне ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе аналізу мастацкага твора.<br>Самастойнае знаходжанне інфармацыі, прад'яўленай у прачытаным творы ў няяўным выглядзе (падтэкст; скрытыя дапушчэнні або сцвярджэнні; выбар дадатковай інфармацыі з ілюстрацыі да тэксту або іншай крыніцы).<br>Маўленне пераважна паслядоўнае, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | звязнае, выразнае з асобнымі маўленчымі і граматычнымі памылкамі |
| 7. | 7 (сем) | Выразнае чытанне цэлымі словамі ў тэмпе, які адпавядае індывідуальнай хуткасці маўлення вучня. Складовае чытанне цяжкіх слоў (незразумелых па сэнсе і складаных па структуры). Правільная перадача інтанацыі сказа, захаванне патрэбнай даўжыні паўз паміж сказамі і абзацамі, унутры сказаў з апорай на аўтарскія знакі прыпынку. Дапускае 2 тэхнічныя памылкі па сэнсавай здагадцы і/або ў пастаноўцы лагічных націскаў | Прымяненне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) літаратуразнаўчых ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (вызначэнне структурных кампанентаў, жанравых асаблівасцей, спосабу пабудовы мастацкага твора – ад асобы аўтара або героя; аналіз, параўнанне і класіфікацыя мастацка-выразных сродкаў мовы; абгрунтаванне і аргументацыя сваіх меркаванняў з апорай на змест прачытанага твора).<br>Выкананне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) у знаёмых сітуацыях дзеянняў, якія патрабуюць чытацкай пісьменнасці (аналітычная работа з тэкстам твора, назіранне за мастацкай формай, мовай твора, сродкамі мастацкай выразнасці; характарыстыка вобразаў мастацкага твора: паэтычных карцін прыроды, герояў, падзей).<br>Вызначэнне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) вучэбнай задачы чытання (што, з якой мэтай павінны прачытаць); спосабаў рашэння чытацкіх задач на аснове вядомых алгарытмаў: планаванне дзейнасці пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразнага чытання, славеснага малявання, складання плана, пераказу, інсцэніроўкі.<br>Устанаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе работы з мастацкім творам.<br>Вызначэнне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) структурных частак вучэбнага матэрыялу, структураванне тэксту ў форме плана, графічнай схемы; |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | інтэрпрэтацыя (тлумачэнне) і інтэграцыя (звязванне) вучэбнай інфармацыі (выяўленне галоўнага і другараднага, падабенства або адрознення паміж героямі, падзеямі, паэтычнымі карцінамі прыроды аднаго або некалькіх твораў, выяўленне прычынна-выніковых сувязей, вызначэнне эмацыянальнага стану героя і суаднясенне гэтага стану з учынкам; характарыстыка героя на падставе аналізу яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў; выказванне сваіх адносін да падзеі, героя, яго ўчынку).<br>Маўленне дакладнае, паслядоўнае, звязнае, выразнае; прысутнічаюць адзінкавыя маўленчыя памылкі |
| 8. | 8<br>(восем) | Выразнае чытанне цэлымі словамі ў тэмпе, які адпавядае індывідуальнай хуткасці маўлення вучня. Правільная перадача інтанацыі сказа, захаванне патрэбнай даўжыні паўз паміж сказамі і абзацамі, унутры сказаў з апорай на аўтарскія знакі прыпынку. Дапускае адну тэхнічную памылку па сэнсавай здагадцы і/або ў пастаноўцы лагічных націскаў | Самастойнае прымяненне літаратуразнаўчых ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (вызначэнне структурных кампанентаў, жанравых асаблівасцей, спосабу пабудовы мастацкага твора – ад асобы аўтара або героя; аналіз, параўнанне і класіфікацыя мастацка-выразных сродкаў мовы; абгрунтаванне і аргументацыя сваіх меркаванняў з апорай на змест прачытанага твора).<br>Самастойнае выкананне ў знаёмых сітуацыях дзеянняў, якія патрабуюць чытацкай пісьменнасці (аналітычная работа з тэкстам твора, назіранне за мастацкай формай, мовай твора, сродкамі мастацкай выразнасці; характарыстыка вобразаў мастацкага твора: паэтычных карцін прыроды, герояў, падзей).<br>Самастойнае вызначэнне вучэбнай задачы чытання (што, з якой мэтай павінны прачытаць); спосабаў рашэння чытацкіх задач на аснове вядомых алгарытмаў: планаванне дзейнасці пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | выразнага чытання, славеснага малявання, складання плана, пераказу, інсцэніроўкі. Самастойнае ўстанаўленне ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе работы з мастацкім творам. Самастойнае вызначэнне структурных частак вучэбнага матэрыялу, структураванне тэксту ў форме плана, графічнай схемы; інтэрпрэтацыя і інтэграцыя вучэбнай інфармацыі (выяўленне галоўнага і другараднага, падабенства або адрознення паміж героямі, падзеямі, паэтычнымі карцінамі прыроды аднаго або некалькіх твораў, выяўленне прычынна-выніковых сувязей, вызначэнне эмацыянальнага стану героя і суаднясенне гэтага стану з учынкам; характарыстыка героя на падставе аналізу яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў; выказванне сваіх адносін да падзеі, героя, яго ўчынку). Маўленне дакладнае, паслядоўнае, звязнае, выразнае; прысутнічаюць адзінкавыя маўленчыя памылкі |
| 9. | 9 (дзевяць) | Выразнае беглае чытанне цэлымі словамі ў тэмпе, які адпавядае індывідуальнай хуткасці маўлення вучня. Правільная інтанацыйная перадача эмацыянальнага зместу твора, настрою, стану, пачуццяў герояў з дапамогай сродкаў маўленчай выразнасці (сіла голасу, тон, тэмп, рытм, паўза, лагічны націск). Адзінкавыя тэхнічныя памылкі выпраляюцца самастойна | Аперыраванне (не ў поўным аб’ёме і/або з дапамогай настаўніка) праграмным вучэбным матэрыялам, прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай, нестандартнай сітуацыі (аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора; усведамленне аўтарскай пазіцыі і спосабаў яе выражэння; творчая інтэрпрэтацыя твора: слоўнае маляванне на аснове ўяўлення паэтычных карцін, эпізодаў тэксту, апісанне героя). Інтэграцыя (не ў поўным аб’ёме і/або з дапамогай настаўніка) ведаў з розных прадметных галін для ацэнкі зместу прачытанага твора. Устанаўленне (не ў поўным аб’ёме і/або з дапамогай настаўніка) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | прычынна-выніковых сувязей і/або аналогій паміж героямі, іх станам і ўчынкамі, падзеямі, карцінамі прыроды; творамі розных жанраў, мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі.<br>Параўнанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) атрыманай інфармацыі і асабістага вопыту, складанне выказванняў параўнальнага характару, высноў, выказванне асабістых меркаванняў; ацэнка зместу прачытанага твора на аснове асабістых перакананняў і вопыту; вызначэнне аўтарскіх адносін да герояў, аўтарскай ацэнкі падзей, персанажаў і супастаўленне з асабістым успрыманнем; аргументацыя асабістага пункту гледжання пра змест прачытанага твора, учынкі герояў, матывы іх паводзін; вызначэнне каштоўнасці вучэбнай інфармацыі для рашэння пастаўленай вучэбнай задачы, выкарыстанне інфармацыі для рашэння вучэбнай або практычнай задачы.<br>Маўленне дакладнае, паслядоўнае, звязнае, выразнае; прысутнічаюць адзінкавыя маўленчыя недакладнасці |
| 10. | 10 (дзесяць) | Выразнае правільнае беглае чытанне цэлымі словамі ў тэмпе, які адпавядае натуральнаму маўленню, з захаваннем выразнасці і правільнасці. Правільная інтанацыйная перадача эмацыянальнага зместу твора, настрою, стану, пачуццяў герояў з дапамогай сродкаў маўленчай выразнасці (сіла голасу, тон, тэмп, рытм, паўза, лагічны націск) | Самастойнае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам, прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай, нестандартнай сітуацыі (аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора; усведамленне аўтарскай пазіцыі і спосабаў яе выражэння; творчая інтэрпрэтацыя твора: слоўнае маляванне на аснове ўяўлення паэтычных карцін, эпізодаў тэксту, апісанне героя).<br>Самастойная інтэграцыя ведаў з розных прадметных галін для ацэнкі зместу прачытанага твора.<br>Самастойнае ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей і/або |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | аналогій паміж героямі, іх станам і ўчынкамі, падзеямі, карцінамі прыроды; творамі розных жанраў, мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі.<br>Самастойнае параўнанне атрыманай інфармацыі і асабістага вопыту, складанне выказванняў параўнальнага характару, высноў, выказванне асабістых меркаванняў; ацэнка зместу прачытанага твора на аснове асабістых перакананняў і вопыту; вызначэнне аўтарскіх адносін да герояў, аўтарскай ацэнкі падзей, персанажаў і супастаўленне з асабістым успрыманнем; аргументацыя асабістага пункту гледжання пра змест прачытанага твора, учынкі герояў, матывы іх паводзін; вызначэнне каштоўнасці вучэбнай інфармацыі для рашэння пастаўленай вучэбнай задачы, выкарыстанне інфармацыі для рашэння вучэбнай або практычнай задачы.<br>Маўленне правільнае, лагічнае, выразнае |

*Манатоннае чытанне – чытанне без захавання інтанацыі сказа (апавядальнай, пытальнай, клічнай), паўз на аўтарскіх знаках прыпынку, лагічнага націску, тону і тэмпу чытання, адпаведных эмацыянальнаму зместу твора.

**Тэхнічныя памылкі – паўторы, замены, перастаноўкі, пропускі, скажэнні слоў, памылкі націску.

***Лагічны націск – інтанацыйнае вылучэнне асобных слоў: пералічэнняў назваў прадметаў, дзеянняў, якасцей; зваротkаў; важных па сэнсе слоў.

Заўвагі:

1. Праверка і ацэнка навыку чытання ўслых, адказу ў вуснай форме на пытанні па прачытаным тэксце ажыццяўляюцца пры самастойным чытанні вучнем незнаёмага або падрыхтаванага дома тэксту, адказе на пытанні па зместу прачытанага тэксту.

2. Крытэрыі ацэнкі навыку чытання ўслых:

спосаб чытання – уменне чытаць прадуктыўным спосабам (плаўна па складах, складамі і словамі, словамі з чытаннем па складах цяжкіх слоў, цэлымі словамі) або непрадуктыўным (чытанне па літарах або адрывіста па складах);

тэмп чытання – хуткасць чытання тэксту, якая суадносіцца з індывідуальным тэмпам гутарковага маўлення;

правільнасць чытання – наяўнасць або адсутнасць тэхнічных і арфаэпічных памылак;

свядомасць – разуменне слоў, сказаў, сэнсавай сувязі паміж імі і агульнага сэнсу прачытанага тэксту або яго часткі.

3. Крытэрыі ацэнкі адказаў у вуснай форме на пытанні па змесце прачытанага тэксту:

паўнацэннасць успрымання – эмацыянальны водгук на прачытанае; аднаўленне ва ўяўленні цэласнага вобраза на аснове мастацкіх дэталей; разважанне над матывамі, абставінамі, наступствамі ўчынкаў персанажаў, іх ацэнка; устанаўленне прычынна-выніковых сувязей; бачанне пункту гледжання, з якога вядзецца апавяданне, вызначэнне аўтарскай пазіцыі; разуменне мастацкай ідэі твора і вызначэнне ўласнага стаўлення да яе;

правільнасць маўлення – наяўнасць або адсутнасць маўленчых і граматычных памылак;

самастойнасць – наяўнасць або адсутнасць дапамогі з боку настаўніка або іншых вучняў.

4. Разам з прадметнымі ажыццяўляецца ацэнка метапрадметных вынікаў:

пошук, інтэрпрэтацыя і выкарыстанне інфармацыі, атрыманай з прачытанага тэксту;

пабудова паведамлення ў вуснай форме;

правільны, лаканічны і лагічны выклад свайго пункту гледжання, аргументацыя сваёй пазіцыі.

5. Крытэрыі ацэнкі метапрадметных вынікаў:

самастойнасць у выкананні вучэбных дзеянняў – наяўнасць або адсутнасць дапамогі з боку настаўніка або іншых вучняў;

паўната аперацыйнага складу выкананых вучэбных дзеянняў – выкананне вучэбных дзеянняў у адпаведнасці з выдзеленай арыенціровачнай асновай, якая ўключае поўную сістэму арыенціраў; наяўнасць усіх аперацый, якія ўваходзяць у склад дзеяння, або іх пропуск;

правільнасць выканання аперацый, якія ўваходзяць у склад дзеяння – наяўнасць або адсутнасць памылак у выкананні вучэбных дзеянняў.

Табліца 2

Нормы ацэнкі выразнага чытання на памяць

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Узнаўленне першых радкоў твора або яго фрагмента (менш за 20 %) з памылкамі ў змесце. Невыразнае, манатоннае чытанне. Дапускае 9 і больш арфаэпічных памылак, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | 2 (два) | Фрагментарнае, невыразнае, манатоннае ўзнаўленне часткі твора (20–40 %). Дапускае 9 і больш арфаэпічных памылак, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка |
| 3. | 3 (тры) | Узнаўленне твора не ў поўным аб'ёме (40–60 %), перастаноўка, замена слоў, пропуск радкоў. Невыразнае, манатоннае чытанне. Дапускае 7-8 арфаэпічных памылак, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх |
| 4. | 4 (чатыры) | Узнаўленне твора не ў поўным аб'ёме (60–80 %), перастаноўка, замена слоў, пропуск радкоў. Чытанне з элементамі выразнасці. Дапускае 7-8 арфаэпічных памылак, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка |
| 5. | 5 (пяць) | Узнаўленне твора не ў поўным аб'ёме (80–90 %) з дапамогай настаўніка; перастаноўка, замена слоў, пропуск радкоў. Чытанне з элементамі выразнасці. Дапускае 5-6 арфаэпічных памылак |
| 6. | 6 (шэсць) | Узнаўленне твора ў поўным аб'ёме. Адзінкавыя выпадкі перастаноўкі, замены слоў, пропуску радкоў. Чытанне з элементамі выразнасці. Дапускае 3-4 арфаэпічныя памылкі |
| 7. | 7 (сем) | Дакладнае ўзнаўленне тэксту твора. Выразнае чытанне. Дапускаюцца 2 арфаэпічныя памылкі |
| 8. | 8 (восем) | Дакладнае ўзнаўленне тэксту твора. Выразнае чытанне. Дапускаецца 1 арфаэпічная памылка |
| 9. | 9 (дзевяць) | Дакладнае ўзнаўленне тэксту твора. Спробы самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі. Дапускаюцца 1-2 запінкі |
| 10. | 10 (дзесяць) | Дакладнае ўзнаўленне тэксту твора. Выразнае чытанне на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі |

Заўвага:

Ацэнка выразнага чытання на памяць адбываецца з улікам крытэрыяў (веданне тэксту і дакладнасць яго ўзнаўлення; выразнасць чытання; захаванне арфаэпічных норм) у адпаведнасці з нормамі ацэнкі выразнага чытання на памяць, якія вызначаны ў табліцы 2.

Табліца 3

Нормы ацэнкі вуснага пераказу

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Неўсвядомленае, фрагментарнае ўзнаўленне тэксту твора з дапамогай настаўніка. Дапускае шматлікія маўленчыя памылкі і працяглыя паўзы. Парушэнне логікі ў перадачы паслядоўнасці падзей. Слоўнікавы запас абмежаваны |
| 2. | 2 (два) | Неўсвядомленае, фрагментарнае ўзнаўленне тэксту твора са шматлікімі маўленчымі памылкамі і працяглымі паўзамі. Парушэнне логікі ў перадачы |

| | | |
|---|---|---|
| | | паслядоўнасці падзей. Слоўнікавы запас абмежаваны |
| 3. | 3 (тры) | Недакладнае, няпоўнае ўзнаўленне зместу твора з дапамогай настаўніка. Парушэнне логікі пераказу. Малавыразнае маўленне са шматлікімі маўленчымі памылкамі |
| 4. | 4 (чатыры) | Недакладнае, няпоўнае ўзнаўленне зместу твора, парушэнне логікі пераказу. Малавыразнае маўленне са шматлікімі маўленчымі памылкамі |
| 5. | 5 (пяць) | Усвядомленае ўзнаўленне зместу твора з дапамогай настаўніка. Пропуск некаторых дэталей, якія перадаюць пачуцці, стан героя. Захаванне паслядоўнасці падзей. Выразнае маўленне з асобнымі маўленчымі памылкамі |
| 6. | 6 (шэсць) | Усвядомленае ўзнаўленне зместу твора з пропускам некаторых дэталей, якія перадаюць пачуцці, стан героя. Захаванне паслядоўнасці падзей. Выразнае маўленне з асобнымі маўленчымі памылкамі |
| 7. | 7 (сем) | Поўны і дакладны, звязны і паслядоўны пераказ зместу твора з дапамогай настаўніка. Выразнае, вобразнае маўленне з адзінкавымі маўленчымі памылкамі |
| 8. | 8 (восем) | Поўны і дакладны, звязны і паслядоўны пераказ зместу твора. Выразнае, вобразнае маўленне з адзінкавымі маўленчымі памылкамі |
